# Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР.

## Паст. 191. Кодэкс аб Працы Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі.

### I. Агульная частка.

1. Кодэкс аб Працы пашыраецца на ўсіх асоб, якія працуюць у наймах, у тым ліку і дома (кватэрнікаў) і абавязковы для ўсіх дзяржаўных, каперацыйных, грамадзкіх і прыватных установ, прадпрыемстваў, гаспадарак і асоб, што ўжываюць наймовую працу.

2. Умовы працы часовых і сэзонных рабочых і служачых, асоб, занятых на лесазагатоўчых і будаўнічых работах, вольнананятых рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў і хатніх работніц рэгулююцца гэтым Кодэксам і спэцыяльнымі законамі (Дадатак I).

3. Наймальнікі, якія парушаюць правілы, устаноўленьня гэтым Кодэксам, а таксама пастановамі і інструкцыямі, выданымі на падставе яго, прыцягваюцца да крымінальнай альбо адміністрацыйнай адказнасьці.

4. Дагаворы і згоды па пытаньнях працы, якія пагаршаюць умовы працы ў параўнаньні з гэтым Кодэксам, ня маюць сілы.

### II. Парадак найманьня і дачы рабочай сілы.

5. Рабочая сіла можа наймацца ўсімі прадпрыемствамі, установамі, гаспадаркамі і асобамі (дзяржаўнымі, каперацыйнымі, грамадзкімі і прыватнымі) праз біржы працы і беспасрэдна.

6. У каляктыўных дагаворах (арт. 13) можа ўстанаўляцца абавязковасьць найманьня рабочай сілы праз біржы працы.

7. Найманьне масавай і групавой рабочай сілы рэгулюецца спэцыяльным законам.

8. Калі ў прадпрыемствах і ўстановах павялічваецца альбо зьмяншаецца колькасьць рабочай сілы больш, як на дзесяць асоб, то прадпрыемствы і ўстановы павінны паведамляць аб гэтым органы Народнага Камісарыяту Працы.

9. Прадпрыемствы і ўстановы павінны падаваць органам Народнага Камісарыяту Працы статыстычныя весткі аб прынятай ва работу рабочай сіле паводле ўстаноўленых правіл.

10. Пасрэднікамі пры найманьні рабочай сілы могуць быць толькі органы Народнага Камісарыяту Працы.

### III. Парадак прыцягненьня да працоўнай павіннасьці грамадзян БССР.

11. Для змаганьня з навальнымі бядотамі, усе грамадзяне БССР, апроч паказаных у артыкуле 12, могуць прыцягвацца да працоўнай павіннасьці паводле пастаноў акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў і мясцовых саветаў.

12. Да працоўнай павіннасьці ня могуць прыцягвацца: а) асобы да 18 гадоў; б) мужчыны ад 45 гадоў, в) жанчыны ад 40 гадоў; г) часова непрацаздольныя асобы на час патрэбны для аднаўленьня працаздольнасьці; д) жанчыны на працягу 8 тыдняў да родаў і 8 тыдняў пасьля родаў; е) жанчыны, якія кормяць грудзьмі; ж) інваліды працы і вайны; з) жанчыны, якія маюць дзяцей да 8 гадоў і ня маюць спэцыяльнае асобы для догляду за імі.

Іншыя льготы ў залежнасьці ад стану здароўя, сямейнага становішча і характару працоўнай павіннасьці могуць устанаўляцца Народным Камісарыятам Працы.

### IV. Каляктыўны дагавор.

13. Каляктыўны дагавор ёсьць згода, якая робіцца прафэсійным саюзам (арт. арт. 152 і 153) як прадстаўніком рабочых і служачых, з аднаго боку, і наймальнікам—з другога. Ён устанаўляе ўмовы працы і найманьня рабочых і служачых для паасобных прадпрыемстваў, устаноў і гаспадарак, альбо для груп іх (арт. 16) і вызначае зьмест будучых працоўных дагавораў (арт. арт. 25 і 26).

14. Каляктыўны дагавор пашыраецца на ўсіх асоб, якія працуюць у даным прадпрыемстве альбо ўстанове, незалежна ад таго, ці зьяўляюцца яны членамі прафэсійнага саюзу, які зрабіў дагавор, ці не.

15. Каляктыўны дагавор не пашыраецца на асоб адміністрацыйнага пэрсаналу, якія маюць права наймаць і звальняць рабочых і служачых,

16. Каляктыўныя дагаворы могуць быць генэральнымі, калі яны пашыраюцца на цэлую галіну вытворчасьці, народнае гаспадаркі альбо кіраўніцтва, і мясцовымі. Калі зроблен генэральны каляктыўны дагавор то рабіць мясцовыя каляктыўныя дагаворы дазваляецца толькі тады, калі гэта прадугледжана генэральным каляктыўным дагаворам.

17. Найбольшы тэрмін, на які могуць рабіцца каляктыўныя дагаворы, устанаўляецца Народным Камісарыятам Працы па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў.

18. Паасобныя артыкулы каляктыўных дагавораў, якія пагаршаюць умовы працы ў параўнаньні з умовамі, устаноўленымі гэтым Кодэксам і іншымі законамі аб працы, ня маюць сілы.

19. Каляктыўныя дагаворы робяцца ў пісанай форме і павінны рэгістравацца ў органах Народнага Камісарыягу Працы. Гэтыя органы могуць скасаваць каляктыўны дагавор у частцы, якая пагаршае становішча рабочых і служачых у параўнаньні з законамі аб працы (арт. 18). Дагавор у другой частцы рэгіструецца толькі тады, калі на гэта згодны абедзьве стораны.

20. Парадак рэгістрацыі каляктыўных дагавораў устанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

21. Нэзарэгістраваны каляктыўны дагавор ня можа быць падставаю для вырашэньня спрэчак.

22. Зарэгістраваны каляктыўны дагавор набывае сілу з дня падпісаньня яго старанамі, альбо ў тэрміны, паказаныя ў самым дагаворы.

23. Калі рээрганізуецца ўстанова альбо прадпрыемства ці пераходзіць да новага ўласьніка, то зарэгістраваны каляктыўны дагавор, астаецца ў сіле на працягу ўсяго тэрміну, на які ён зроблен.

Пры нязгодзе з тым, каб каляктыўны дагавор астаўся ў сіле, пытаньне вырашаецца ў канфліктным парадку.

24. Каляктыўныя дагаворы, дзеяньне якіх астаецца і на новы тэрмін, хаця-б і на ранейшых умовах,а таксама ўсе зьмены і дапаўненьні, якія робяцца ў дагаворы, павінны рэгістравацца на агульных падставах (арт. 20).

25. Нагляд за выкананьнем калектыўных дагавораў ускладаецца ў першую чаргу на расцэначна-канфліктныя камісіі (арт. 169).

### V. Працоўны дагавор.

26. Працоўны дагавор ёсьць згода ў пісанай альбо вуснай форме двух альбо больш асоб, паводле якой рабочы альбо служачы дае сваю рабочую сілу за плату.

Працоўны дагавор робіцца незалежна ад таго, ці зроблен калектыўны дагавор.

27. Ня маюць сілы ўмовы працоўнага дагавору, якія пагаршаюць становішча рабочых і служачых у параўнаньні з умовамі, устаноўленымі законамі аб працы, калектыўнымі дагаворамі і правіламі ўнутранага парадку, што пашыраюцца на данае прадпрыемства альбо ўстанову (арт. арт. 4, 13 і 50—52), ня маюць таксама сілы ўмовы, якія абмяжоўваюць палітычныя альбо агульнаграмадзянскія правы рабочага альбо служачага.

28. Калі зроблен працоўны дагавор, то абавязкова павінна выдавацца разьліковая кніжка ўсім рабочым і служачым, апроч асоб адміністрацыйнага складу, ва ўсіх прадпрыемствах, установах і гаспадарках. Разьліковая кніжка можа не выдавацца, калі дагавор зроблен менш, як на тыдзень.

29. Працоўныя дагаворы робяцца: а) на пэўны тэрмін, але ня больш аднаго году; б) на няпэўны тэрмін; в) на час выкананьня якой-небудзь работы.

30. Калі працоўны дагавор зроблен з арцельлю, то, апроч разьліковай кніжкі для кожнага члена арцелі, выдаецца адна разьліковая кніжка для ўсяе арцелі.

31. Асобы ад чатырнаццаці да васемнаццаці гадоў могуць рабіць працоўныя дагаворы самі. Бацькі, апякуны, усынавіцелі, папячыцелі, а таксама ўстановы і службовыя асобы, якія наглядаюць за выкананьнем законаў аб ахове працы, маюць права патрабаваць датэрміновага скасаваньня дагавору, калі ён пагражае здароўю непаўналетняга альбо іначай можа пашкодзіць яму.

32. Па працоўным дагаворы, які зроблен ад імя гаспадаркі, прадпрыемства альбо ўстановы іх прадстаўніком, адказвае гаспадарка, прадпрыемства альбо ўстанова, для якіх выконваецца работа.

Па працоўных дагаворах з падрадчыкам адказвае падрадчык.

33. Спрэчкі па дагавору аб падрадзе разглядаюцца на падставе Грамадзянскага і Грамадзянска-Працэсуальнага Кодэксу і спэцыяльных законаў.

34. Калі працоўны дагавор зроблен з арцельлю, то наймальнік да кожнага члена арцелі мае тыя самыя правы і абавязкі, якія ён бы меў, калі-б ён зрабіў дагавор з кожным членам арцелі ў паасобку.

35. Рабочы альбо служачы ня мае права бяз згоды наймальніка даручаць выкананьне ўскладзенай на яго работы іншай асобе. Арцель, якая зрабіла працоўны дагавор, можа замяняць адных членаў другімі, калі гэта не забаронена дагаворам.

36. Наймальнік можа патрабаваць ад рабочага альбо служачага толькі тую работу, для якой ён наняты і якая адпавядае законам аб працы.

Даручэньне работы відавочна небясьпечнай для жыцьця забараняецца.

37. Наймальнік мае права перавесьці рабочага альбо служачага на іншую работу, якая адпавядае яго кваліфікацыі, калі ў прадпрыемстве, установе альбо гаспадарцы часова няма работы.

Калі рабочы альбо служачы адмаўляецца выконваць гэтую работу, то наймальнік мае права звольніць яго, выдаўшы выходную дапамогу паводле арт. 88.

Кожны рабочы альбо служачы можа прыцягвацца для работы, якая хаця і не адпавядае яго кваліфікацыі, але патрэбна для адхіленьня небясьпекі, што пагражае прадпрыемству, установе альбо гаспадарцы незалежна ад яго кваліфікацыі.

Ва ўсіх паказаных выпадках заработная плата ня можа быць зьменшана. Калі часовая работа аплачваецца вышэй за тую работу, на якую нанят рабочы альбо служачы, то аплата робіцца па вышэйшай стаўцы.

38. Рабочы альбо служачы можа быць пераведзены наймальнікам з аднаго прадпрыемства альбо ўстановы ў другую, альбо з аднае мясцовасьці ў другую, толькі калі ён згодзен на гэта. Калі рабочы альбо служачы ня згодзен на перавод, то працоўны дагавор можа быць скасован наймальнікам, прычым рабочаму альбо служачаму выплачваецца выхадная дапамога, паводле арт. 88.

39. Прымаючы рабочых альбо служачых на працу, наймальнік можа рабіць спробу іх: рабочых—на працягу ня больш 6 дзён, а служачых на працягу ня больш месяца—для адказных работ і ня больш 2-х тыдняў—для ўсіх іншых работ.

40. Рабочы альбо служачы за час спробы атрымлівае заработную плату па той пасадзе, для заняцьця якой яму назначана спроба. Калі пасьля спробы рабочага альбо служачага не паведамілі, што ён ня прыняты на работу, то ён лічыцца прынятым. Калі пасьля спробы рабочы альбо служачы ня прымаецца на работу, то яму выхадная дапамога не выдаецца.

41. Да канца спробы (арт. 39) рабочы альбо служачы лічыцца беспрацоўным і за ім захоўваецца ўстаноўленая ў органах Народнага Камісарыяту Працы чарга на пасылку на работу.

42. Наймальнік павінен выдаць рабочаму альбо служачаму па яго просьбе пасьведчаньне аб тым, колькі часу і на якой пасадзе ён працаваў у яго.

Наймальнікі ня маюць права перадаваць адзін другому сакрэтныя весткі аб рабочым альбо служачым.

Пастановы органаў Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі аб забароне служыць у дзяржаўных, каперацыйных і іншых грамадзкіх установах, прадпрыемствах і арганізацыях павінны адзначацца ў працоўных сьпісах асоб, якім забараняецца служба ў гэтых установах, прадпрыемствах і арганізацыях.

43. Наймальнік ня мае права накладаць на рабочага альбо служачага якія-небудзь грашовыя спагнаньні, апроч выпадкаў, прадугледжаных асобнымі законамі альбо правіламі ўнутранага парадку.

44. Працоўны дагавор касуецца: а) па згодзе старон; б) пасьля зыходу тэрміну; в) пасьля заканчэньня работы, на якую рабочы альбо служачы быў наняты; г) па заяве аднае з старон паводле арт. 46 і 47.

45. Працоўны дагавор астаецца ў сіле і тады, калі ўстанова, прадпрыемства альбо гаспадарка пераходзіць ад аднаго ведамства ці ўласьніка да другога.

Калі пасьля зыходу тэрміну дагавору ніводная з старон не патрабуе скасаваньня працоўнага дагавору, то ён астаецца ў сіле на ранейшых умовах на нявызначаны тэрмін.

46. Калі дагавор зроблен на нявызначаны тэрмін, то рабочы альбо служачы можа патрабаваць яго скасаваньня ва ўсякі час, але павінен папярэдзіць наймальніка: пры тыднёвым разьліку—ня менш, як за

адзін дзень, а пры двухтыднёвым альбо месячным разьліку—ня менш як за сем дзён.

47. Кожны працоўны дагавор, можа быць скасованы па патрабаваньні наймальніка толькі ў наступных, апроч прадугледжаных арт. арт. 37 і 38, выпадках: а) калі зусім альбо часткова ліквідуецца прадпрыемства, установа альбо гаспадарка, а таксама скарачаецца работа ў іх; б) калі прыпынена работа на тэрмін больш аднаго месяца з прычыны вытворчага характару, рамонту, пераабсталяваньня і да т. п.; в) калі рабочы альбо служачы нягодны да работы; г) калі рабочы альбо служачы сыстэматычна ня выконвае бяз важных прычын абавязкаў, ускладзеных на іх дагаворам альбо правіламі ўнутранага парадку; д) калі рабочы альбо служачы зробіць учынак, які караецца ў крымінальным парадку, беспасрэдна зьвязан з яго работаю і ўстаноўлен набыўшым сілу прысудам, а таксама калі рабочы альбо служачы арыштован на тэрмін больш двух месяцаў, е) калі рабочы альбо служачы прапусьціць бяз важных прычын тры рабочых дні ў месяц; ж) калі рабочы альбо служачы ня прыходзіць на работу з прычыны часовай страты працаздольнасьці чатыры месяцы ад дня страты яе, а з прычыны страты працаздольнасьці пасьля цяжарнасьці і родаў—чатыры месяцы пасьля ўстаноўленага арт. 92 чатырох-месячнага тэрміну.

Дагавор у выпадках, паказаных у п. „в“ гэтага арт. можа быць скасаваны толькі са згоды расцэначна-канфліктнае камісіі. Дагавор у выпадках, паказаных у п. „г“ гэтага арт. можа быць скасаваны: а) у дзяржаўных установах, а таксама ў дзяржаўных прамысловых, транспартных, гандлёвых і іншых прадпрыемствах па загаду наймальніка, аднак, рабочы альбо служачы мае права абскардзіць звальненьне ў расцэначна-канфліктную камісію; б) ва ўсіх іншых установах і прадпрыемствах—толькі са згоды расцэначна-канфліктнай камісіі.

Адказныя работнікі дзяржаўных, каперацыйных і грамадзкіх установ і прадпрыемстваў паводле сьпісу, які ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Працы па згодзе з ЦСПС, могуць звальняцца бяз згоды расцэначна-канфліктнай камісіі.

Дагавор з рабочым альбо служачым, які зьяўляецца членам фабрычна-заводзкага камітэту альбо іншага адпаведнага органу, касуецца паводле гэтага арт. і артыкулу 161 гэтага Кодэксу.

Калі дагавор касуецца наймальнікам у выпадках, паказаных у п.п. „а“, „б“ і „в“, то наймальнік павінен папярэдзіць рабочага альбо служачага аб звальненьні за два тыдні; кампэнсацыя ў такім разе выдаецца паводле артыкулу 88.

48. Рабочы альбо служачы можа скасаваць зроблены ім на пэўны тэрмін дагавор да зыходу яго тэрміну толькі:

а) калі яму ня выплачваецца ў тэрмін заработная плата;

б) калі наймальнік парушае прынятыя на сябе паводле дагавору абавязкі альбо законы аб працы.

в) калі наймальнік і члены яго сям'і недалікатна абыходзяцца з рабочым альбо служачым;

г) калі пагоршаны санітарна-гігіенічныя ўмовы працы;

д) ва ўсіх іншых выпадках, асобна паказаных у законе.

Па пратэсту наймальніка выпадкі, паказаныя ў п. п. „а“, „б“ і „в“ гэтага артыкулу, устанаўляюцца расцэначна-конфліктнаю камісіяю, а калі такой няма—іншымі канфліктнымі органамі.

49. Усякі працоўны дагавор можа быць скасован таксама па патрабаваньні прафэсійнага саюзу. Калі наймальнік ня згодзен з патрабаваньнем саюзу, то ён можа падаць скаргу ў канфліктным парадку.

### VI. Правілы ўнутранага парадку.

50. Для рэгуляваньня працы ў прадпрыемствах установах і гаспадарках, у якіх працуе ня менш пяці рабочых альбо служачых, павінны быць устаноўлены правілы ўнутранага парадку. Гэтыя правілы абавязковы для рабочага альбо служачага толькі тады, калі яны выданы ва ўстаноўленым парадку (арт. арт. 52—54) і абвешчаны ўсім рабочым альбо служачым.

51. У правілах унутранага парадку павінны быць паказаны ўсе агульныя і спэцыяльныя абавязкі рабочых альбо служачых і адміністрацыі і адказнасьць за іх парушэньне.

52. Правілы ўнутранага парадку не павінны супярэчыць законам, пастановам аб працы і каляктыўнаму дагавору.

53. Правілы ўнутранага парадку для паасобных дзяржаўных, капэрацыйных, грамадзкіх і прыватных установ і прадпрыемстваў распрацоўваюцца адміністрацыяю прадпрыемства, узгадняюцца з фабрычна-заводзкім альбо мясцовым камітэтам і зацьвярджаюцца акруговаю інспэкцыяй працы; на пастановы акруговай інспэкцыі працы могуць падавацца скаргі ў Народны Камісарыят Працы, пастановы якога зьяўляюцца канчатковымі.

54. Для паасобных галін народнае гаспадаркі, для цэнтральных установ, для паасобных трэстаў, камбінатаў і да т. п. і іншых асабліва важных для дзяржавы прадпрыемстваў, правілы ўнутранага парадку могуць распрацоўвацца па згодзе паміж Цэнтральным Кіраўніцтвам адпаведнага прафэсійнага саюзу і адміністрацыяй і зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Працы. Для разьвіцьця такіх правіл могуць выдавацца для паасобных прадпрыемстваў і ўстаноў дадатковыя правілы ўнутранага парадку.

### VII. Нормы вырабкі.

55. Нормы вырабкі ўстанаўляюцца адміністрацыяй прадпрыемства альбо ўстановы па згодзе з прафэсійным саюзам альбо яго органам (арт. арт. 151 і 157).

56. Калі рабочы альбо служачы ў нармальных умовах працы па сваёй віне не вырабляе ўстаноўленай нормы, то ён атрымлівае заработную плату за выкананую частку работы, але ў кожным разе ня менш двух трацін тарыфнай стаўкі. Калі-ж рабочы альбо служачы сыстэматычна не вырабляе ўстаноўленай нормы, дык можа быць звольнен паводле арт. 47 гэтага Кодэксу.

Нармальнымі ўмовамі працы лічацца:

а) спраўны стан машын, варштатаў і пryладаў;

б) своечасная падача матарыялаў і начыньня, патрэбных для выкананьня работы;

в) належная якасьць матарыялаў і начыньня;

г) належнае гігіенічнае і санітарнае абсталяваньне памяшканьня, дзе выконваецца работа (належнае асьвятленьне, апал і інш.).

57. Для непаўналетніх рабочых, якія працуюць няпоўны рабочы дзень, пры часовай аплаце працы, нормы вырабкі ўстанаўляюцца ў адпаведнасьці з нормамі вырабкі для дарослых рабочых прапарцыянальна іх рабочаму дню.

### VIII. Аплата працы.

58. Разьмер платы рабочаму альбо служачаму за яго працу вызначаецца каляктыўным і працоўным дагаворам.

59. Разьмер платы ня можа быць меншым абавязковага мінімуму заработнай платы, устаноўленага спэцыяльным законам.

60. Разьмер платы вызначаецца дагаворамі альбо пачасова з разьліку звычайнага рабочага дня (арт. 94), альбо зьдзельна. Разьмер платы за работу ў звышмерны час павінен быць паказан у дагаворы асобна, прычым плата гэта павінна быць павялічана ня менш, як напалову звычайнай платы за першыя дзьве гадзіны, і ня можа быць меншаю падвойнага разьмеру за наступныя гадзіны і за работу ў дні адпачынку альбо сьвяточныя дні. Падлеткі за скарочаны рабочы дзень аплачваюцца як за поўны рабочы дзень адпаведнай катэгорыі рабочых.

61. Парадак вылічэньня і ўстанаўленьня нормаў аплаты працы падлеткаў у залежнасьці ад характару і ўмоў працы ў адпаведных галінах гаспадаркі ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

62. Калі рабочы альбо служачы выконвае работы рознай кваліфікацыі, то заработная плата яму выдаецца за работу вышэйшай кваліфікацыі (арт. 37).

63. Калі рабочы альбо служачы выконвае работу, для якой патрэбны спэцыяльныя веды, то праца яго аплачваецца ў разьмеры, устаноўленым для данай катэгорыі працы, і тады, калі ён ня мае пасьведчаньня аб спэцыяльных ведах.

64. Калі рабочы альбо служачы пераводзіцца на другую работу, якая аплачваецца менш, то за ім захоўваецца ранейшы заработак на працягу 2-х тыдняў ад дня пераводу.

65. Калі работа мае сталы характар, то заработная плата павінна выдавацца пэрыядычна, але ня менш аднаго разу на два тыдні.

Плата за часовую работу, менш двух тыдняў, выплачваецца пасьля сканчэньня работы.

66. Заработная плата выплачваецца грашмі, а калі гэта ўстаноўлена ў працоўным альбо каляктыўным дагаворы—натураю (дачаю кватэры, харчоў). Умовы выдачы платы натураю, парадак яе расцэнкі, а таксама разьмер грашовай часткі аплаты, калі другая частка аплачваецца натураю, устанаўляюццца дагаворам.

67. Заработная плата выплачваецца ў рабочы час і на месцы выкананьня работы.

68. Калі працоўны ня выканаў работы па прычынах ад яго незалежных, то заработная плата выплачваецца па яго сярэдняму падзённаму заработку.

Парадак вылічэньня сярэдняга заработку ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

69. Рабочым і служачым, якія ідуць у чарговы водпуск, выплачваецца наперад за час водпуску іх сярэдні заработак.

70. Зьдзельная альбо паштучная аплата вызначаецца падзелам устаноўленай падзённай стаўкі данай катэгорыі на норму вырабкі (арт. 55), калі ў дагаворы не ўстаноўлен іншы спосаб расцэнак.

71. Калі рабочы альбо служачы выконвае спэцыяльную работу паводле зьдзельнага нараду, то ён атрымлівае ва ўстаноўленыя тэрміны (арт. 65) авансы ў разьмеры тарыфнай стаўкі яго катэгорыі.

72. Калі рабочы альбо служачы ня выканаў паводле зьдзельнага нараду нормы па сваёй тарыфнай стаўцы, то яму выплачваецца заработная плата за выкананую частку работы, але ня менш, як дзьве траціны яго тарыфнай стаўкі (арт. 56).

73. Калі рабочы альбо служачы ня выканаў зьдзельнага нараду па прычынах ад яго незалежных, то выкананая ім частка нараду аплачваецца па ацэнцы, зробленай расцэначна-канфліктнаю камісіяю,

а калі няма расцэначна-канфліктнай камісіі альбо ёсьць спрэчкі паміж старанамі—у канфліктным парадку.

74. Зьдзельныя работы падлеткаў аплачваюцца па расцэнках, аднолькавых са зьдзельнымі расцэнкамі дарослых, з даплатаю за дзьве гадзіны па іх тарыфнай стаўцы.

75. Разам са зьменаю ставак пачасовай аплаты працы, адпаведна зьмяняюцца і расцэнкі зьдзельных работ.

76. Работы, пачатыя да зьмены зьдзельных расцэнак, аплачваюцца ў разьмерах, устаноўленых расцэначна-канфліктнаю камісіяю, а дзе яе няма—па згодзе наймальніка з адпаведным прафэсійным саюзам.

Калі расцэнка не ўстаноўлена расцэначна-канфліктнаю камісіяю, а таксама калі ёсьць спрэчкі паміж наймальнікам і прафэсійным саюзам, то пытаньне вырашаецца ў канфліктным парадку.

### IX. Гарантыі і кампэнсацыі.

77. За рабочымі і служачымі захоўваецца сярэдні заработак (арт. 68) у час ажыцьцяўленьня імі свайго выбарнага права.

78. За рабочымі і служачымі, якія выклікаюцца ў суд як сьведкі, экспэрты ці засядацелі, захоўваецца сярэдні заработак за ўвесь час выкананьня імі гэтых абавязкаў.

79. За рабочымі і служачымі, выбранымі прадстаўнікамі на зьезды, канфэрэнцыі, сходы ўпаўнаважаных, якія склікаюцца органамі дзяржаўнымі, прафэсійнымі і спажывецкае капярацыі, захоўваецца сярэдні заработак за ўвесь рабочы час, калі імі ажыцьцяўляюцца абавязкі прадстаўнікоў.

80. Рабочыя альбо служачыя, якія звальняюцца з прычыны прызыву ў Чырвоную Армію, атрымліваюць сярэдні заработак за два тыдні наперад.

81. За рабочымі і служачымі, якія камандыруюцца па службовых справах, захоўваецца за ўвесь час камандыроўкі іх заработак, апроч таго, ім выплачваюцца сутачныя і выдаткі, зьвязаныя з камандыроўкаю, у парадку і ў разьмерах, устаноўленых спэцыяльным законам.

82. Пры пераезьдзе рабочага альбо служачага па загаду наймальніка, калі пры гэтым рабочы альбо служачы павінен пераехаць у іншае паселішча, наймальнік павінен выдаць рабочаму альбо служачаму кампэнсацыю, прадугледжаную спэцыяльным законам.

83. За псаваньне прыладаў, вырабаў і матарыялаў па нядбайнасьці рабочага альбо служачага па пастанове расцэначна-канфліктнай камісіі з заработку рабочага альбо служачага можа быць утрымана аднаразовая сума ў разьмеры кошту сапсаванага, але ня больш трацiны яго месячнай тарыфнай стаўкі.

84. Наймальнік дае бясплатна рабочаму альбо служачаму начыньне альбо прылады, патрэбныя для работы.

85. Калі для патрэбы прадпрыемства рабочы альбо служачы скарыстоўвае сваё начыньне, то наймальнік павінен заплаціць рабочаму альбо служачаму за амартызацыю начыньня суму, вызначаную каляктыўным дагаворам. Калі парадак вылічэньня гэтае сумы ня вызначан у каляктыўным дагаворы, то гэтая сума вылічаецца паводле пастановы Народнага Камісарыяту Працы.

86. У прадпрыемствах, дзе па ўмовах працы хутка псуецца вопратка і абутак, наймальнік павінен бясплатна даваць занятым у яго прадпрыемстве рабочым і служачым вопратку і абутак паводле сьпісу і норм, якія ўстанаўляюцца Народным Камісарыятам Працы.

87. За рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў, якія прыпынілі сваю працу на тэрмін да аднаго месяца, захоўваецца заработак у разьмеры іх тарыфнай стаўкі.

Калі робота прадпрыемства альбо ўстановы прыпыняецца ня больш, як на тры дні, то рабочым і служачым за час прастою выдаецца сярэдні заработак (арт. 68).

88. Калі працоўны дагавор, зроблены на пэўны тэрмін альбо без вызначэньня тэрміну, касуецца па прычынах, паказаных у п. п. „а“, „б“ і „в“ артыкулу 47, то наймальнік павінен выплаціць рабочаму альбо служачаму выхадную дапамогу ў разьмеры яго двухтыднёвага заработку, альбо папярэдзіць яго за два тыдні аб тым, што ён будзе зволен.

89. Калі працоўны дагавор касуецца па прычынах, паказаных у арт. арт. 37, 38 і 48, то рабочаму альбо служачаму выдаецца выхадная дапамога ў разьмеры двухтыднёвага сярэдняга заработку.

90. Калі працоўны дагавор касуецца па прычынах, паказаных у п. п. „г“, „д“, „е“ і „ж“ арт. арт. 47, 49, а таксама па жаданьні рабочага альбо служачага, паводле арт. 46, то выхадная дапамога не выдаецца.

Выхадная дапамога таксама не выдаецца асобам, якім органамі рабоча-сялянскай інспэкцыі забаронена служба ў дзяржаўных, кааперацыйных і іншых грамадзкіх установах, прадпрыемствах і арганізацыях.

91. Калі прадпрыемства альбо ўстанова не дае рабочаму альбо служачаму асноўнага альбо дадатковага водпуску (арт. арт. 114 і 115), то з дазволу расцэначна-канфліктнай камісіі, а дзе яе няма—з дазволу адпаведнага органу прафэсійнага саюзу, рабочы альбо служачы мае права атрымаць кампэнсацыю грашмі з разьліку яго сярэдняга заработку да моманту выдачы кампэнсацыі.

92. Рабочыя і служачыя, якія часова страцілі працаздольнасць, могуць вярнуцца на сваё месца ва ўстанову альбо прадпрыемства, на працягу чатырох месяцаў (арт. арт. 47—п. „ж“ і 132).

93. Калі наймальнік абвяшчаецца немаемным, то ўсе выплаты рабочым і служачым, якія вынікаюць з каляктыўных і працоўных дагавораў, здавальняюцца ў першую чаргу паводле арт. 311 Гр. Прац. Кодэксу.

### X. Рабочы час.

94. Нармальны рабочы час у прадпрыемствах і ўстановах, якія іх абслугоўваюць (канторах, складах і г. д.), ня можа перавышаць васьмі гадзін і сямі гадзін для тых прадпрыемстваў, якія пераведзены на сямігадзінны рабочы дзень паводле Маніфэсту II-й Сэсіі ЦВК СССР IV-га скліканьня за 15 кастрычніка 1927 г.

Парадак пераводу прадпрыемстваў на сямігадзінны рабочы дзень і ўмовы працы на гэтых прадпрыемствах устанаўляюцца спэцыяльным законам.

Народны Камісарыят Працы па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў устанаўляе катэгорыю адказных палітычных, прафэсійных, савецкіх і іншых работнікаў з ненармаваным рабочым днём.

95. Рабочы час ня можа перавышаць шасьці гадзін:

а) для асоб ад 16 да 18 гадоў;

б) для асоб, занятых разумоваю і канторскаю працаю, апроч тых асоб, работа якіх беспасрэдна зьвязана з прадпрыемствам;

в) для асоб, занятых на падземных работах паводле сьпісу прафэсій, устаноўленых Народным Камісарыятам Працы.

Для асоб, якія працуюць на асабліва цяжкіх і шкодных для здароўя работах паводле сьпісу Народнага Камісарыяту Працы ўстанаўляецца скарочаны рабочы дзень.

96. Для начных работ ад 10 гадзін вечера да 6-ці гадзін раніцы рабочы час, установлены артыкуламі 94 і 95, скарочваецца на адну гадзіну.

Калі работа і дзяжурства праводзяцца зьменамі, то рабочы час для начной зьмены ўстанаўляецца паводле арт. арт. 94 і 95. У такіх разох адна начная гадзіна аплачваецца як $^{8}/_{7}$ (арт. 94) альбо $^{6}/_{5}$ (арт. 95) дзённага часу.

Пры зьдзельнай аплаце рабочыя атрымліваюць за кожную гадзіну начной работы звыш зьдзельнага заработку адну сёмую частку (арт. 94) альбо адну пятую частку (арт. 95) іх пагадзіннай тарыфнай стаўкі.

97. Рабочы час занятых на сталай рабоце з памесячнаю аплатаю рамонтных і сельска-гаспадарчых рабочых, вартаўнікоў, апальшчыкаў, дворнікоў, прыбіральшчыкаў і да іх падобных катэгорый рабочых можа быць падзелен ня больш як на тры часткі з тым, каб велічыня рабочага часу на працягу месяца не перавышала нармальнай месячнай колькасьці рабочых гадзін.

98. На працягу нармальнага рабочага часу рабочаму альбо служачаму павінен быць дадзены перапынак для адпачынку і яды. У правілах унутранага парадку павінна быць паказана месца для яды. Час перапынку не залічваецца ў рабочы час.

99. Рабочы альбо служачы мае права ў часе перапынку пакідаць месца работы. Адступленьні ад паказанага ў гэтым артыкуле правіла, апроч тых прадпрыемстваў і ўстаноў, у якіх гэта забаронена спэцыяльнаю пастановаю, могуць рабіцца са згоды адпаведнага прафэсійнага саюзу па пастанове органаў Народнага Камісарыяту Працы.

100. Пры работах з рэгулярнымі пэрапынкамі, пэрапынак павінен быць не пазьней як праз чатыры гадзіны пасьля пачатку работы. Велічыня перапынку ўстанаўляецца правіламі ўнутранага парадку і ня можа быць менш за поўгадзіны і ня больш за дзьве гадзіны.

Правілы аб асобных перапынках для матак, якія кормяць грудзьмі, паказаны ў арт. 134.

101. Пачатак і канец рабочага дня ўстанаўляецца правіламі ўнутранага парадку.

102. Пры рабоце зьменамі, замена аднэй зьмены другою робіцца паводле правіл унутранага парадку бяз шкоды для нармальнага ходу работ.

103. Работа звыш нармальнага рабочага часу (звышмерная) не дазваляецца, апроч наступных выпадкаў:

а) пры выкананьні работ, патрэбных для абароны дзяржавы і для недапушчэньня грамадзкай небясьпекі і навальных бядот;

б) пры правядзеньні грамадзка-патрэбных работ у справе забясьпечаньня вадою, асьвятленьнем, каналізацыяю, паштова-тэлеграфнаю і тэлефоннаю сувязьзю для адхіленьня выпадковых альбо неспадзяваных акалічнасьцяй, якія парушаюць правільную іх дзейнасьць;

в) пры патрэбе скончыць работу, якая з прычыны нечаканага затрыманьня не магла быць скончана ў нармальны рабочы час, калі пры гэтым спыненьне пачатай работы можа выклікаць папсаваньне матарыялаў альбо машын;

г) пры часовых работах па рамонту і аднаўленьні мэханізмаў і пабудоў, калі гэта выклікае спыненьне работы для значнае колькасьці рабочых альбо служачых.

Ужываньне ў паказаных у гэтым арт. выпадках звышмерных работ дазваляецца толькі па пастанове расцэначна-канфліктнай камісіі, а калі яе няма, то са згоды адпаведнага прафэсійнага саюзу і дазволу інспэктара працы, а ў экстраных выпадках без устаноўленага дазволу, аднак, аб гэтым павінна быць паведамлена інспэкцыя працы.

104. Асобы да 18 гадоў не дапушчаюцца да звышмерных работ ні пры якіх умовах.

105. Кожны рабочы альбо служачы ня можа быць на працягу году занят на звышмерных работах больш за 120 гадзін, а на працягу двох дзён адзін за адным ня больш за чатыры гадзіны.

106. На сэзонных работах паказаныя нормы звышмерных работ могуць быць павялічаны Народным Камісарыятам Працы па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў.

107. Не дазваляецца звышмерная работа для адработкі часу, патрачанага з прычыны спазьненьня на работу.

108. Аб кожнай звышмернай рабоце павінна быць адзначана ў разьліковай кніжцы рабочага альбо служачага, а таксама і ў ведамасьцях звышмерных работ з паказаньнем часу пачатку і канца работ і заработнай платы, атрыманай працоўным за звышмерную работу.

### XI. Час адпачынку.

109. Усім рабочым і служачым даецца штотыднёвы бесьперарыўны адпачынак ня менш за 42 гадзіны. Дні штодыднёвага адпачынку устанаўляюцца мясцовымі органамі працы па згодзе з саветамі прафэсійных саюзаў у залежнасьці ад характару работы і нацыянальнага і рэлігійнага складу рабочых і служачых данай мясцовасьці.

110. Тым рабочым альбо служачым, якія па ўмовах працы ня могуць карыстацца агульна ўстаноўленым штотыднёвым днём адпачынку, адпачынак павінен давацца ў іншыя дні.

111. Забараняецца працаваць у наступныя сьвяточныя дні:

а) 1 студзеня—новы год і дзень абвяшчэньня Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі;

б) 22 студзеня—дзень 9 студзеня 1905 г. і дзень памяці Ў. І. Леніна;

в) 12 сакавіка—дзень, у які скінута царскае самаўладзтва;

г) 18 сакавіка—дзень Парыскай Камуны;

д) 1 і 2 мая—дні Інтэрнацыяналу;

е) 7 і 8 лістапада—дні Пралятарскай Рэволюцыі.

112. Народны Камісарыят Працы па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў устанаўляе, апроч дзён, паказаных у арт. 111, яшчэ шэсьць дзён адпачынку, кіруючыся мясцовымі нацыянальна-бытавымі ўмовамі.

Народны Камісарыят Працы па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў мае права ўстанаўляць сьпісы прадпрыемстваў і ўстаноў, якія па ўмовах іх працы павінны працаваць без перапынку сьвяточныя дні і дні адпачынку.

113. Напярэдадні дзён адпачынку і сьвяточных дзён (арт. арт. 109—111) рабочы дзень не павінен паравышаць шасьці гадзін і аплачваецца, як поўны рабочы дзень. Пры зьдзельнай аплаце недапрацованыя гадзіны павінны аплачвацца па тарыфных стаўках.

114. Усім рабочым альбо служачым, калі яны працавалі без перапынку ня менш пяці з паловаю месяцаў, даецца адзін раз на год чарговы водпуск ня менш як на два тыдні, а для асоб да 18 гадоў—ня менш, як на адзін месяц.

Праца лічыцца бесперапыннаю і тады, калі рабочы альбо служачы пераводзіцца па загаду адміністрацыі з аднаго прадпрыемства (установы) у другое, альбо калі рабочы і служачы пераходзіць без перапынку ў рабоце з аднае ўстановы (прадпрыемства) у другую.

115. Асобам, якія працуюць у асабліва шкодных і набясьпечных прадпрыемствах і ў мясцовасьцях з шкоднымі кліматычнымі ўмовамі, даецца апроч чаргозага дадатковы водпуск ня менш за два тыдні.

Пералік галін працы і прафэсій, якія даюць права на дадатковы водпуск, устанаўляецца Народным Камісарыятам Працы.

116. Забараняецца замена дадатковага водпуску (арт. 115) і чарговага водпуску непаўналетніх (арт. 114) грашоваю кампэнсацыяю апроч выпадкаў, прадугледжаных спэцыяльнымі пастановамі Народнага Камісарыяту Працы.

117. Адпускі даюцца на працягу ўсяго году з такім разьлікам, каб імі не парушаўся нармальны ход работ у прадпрыемствах, установах і гаспадарках.

118. Час і парадак дачы водпуску ўстанаўляецца расцэначна-канфліктнаю камісіяю, а дзе яе няма—наймальнікамі па згодзе з прадстаўнікамі рабочых альбо служачых (арт. 157).

Спрэчкі вырашаюцца іншымі канфліктнымі органамі.

119. Адпускі, якія даюцца рабочым альбо служачым з прычыны хваробы альбо паводле арт. 132, у лік чарговых і дадатковых адпускоў ня ўключаецца.

120. Калі чарговы водпуск ня быў скарыстаны не па віне рабочага альбо служачага і ён не атрымаў за яго кампэнсацыю (арт. 91), то ў наступным годзе водпуск можа быць павялічаны на нескарыстаны час водпуску. Злучэньне водпуску больш, чымся за 2 гады, забараняецца.

### XII. Вучнёўства.

121. Вучнямі лічацца асобы, якія вучацца ў школах вучнёўства, навучальных брыгадах і майстэрнях і асобы, якія праходзяць індывідуальнае навучаньне на працы пад кіраўніцтвам кваліфікаваных рабочых.

122. Час вучнёўства ўстанаўляецца Народным Камісарыятам Працы ня больш за 4 гады для самай высокай кваліфікацыі.

123. Норма вучняў для ўстаноў і прадпрыемстваў устанаўляецца асобным законам.

124. Вучням не павінна давацца работа не з тае спэцыяльнасьці, якой яны вучацца.

125. Правілы навучаньня вучняў выдаюцца Народным Камісарыятам Працы разам з Народным Камісарыятам Асьветы пасьля ўзгадненьня з зацікаўленымі органамі і абавязковы для ўсіх прадпрыемстваў і устаноў.

126. Веды вучняў пасьля зыходу тэрміну іх навучаньня правяраюцца. Па просьбе вучня праверка ведаў можа быць зроблена і раней зыходу часу вучнёўства.

127. Вучнёўства ў саматужнікаў, рамесьнікаў, прамысловай капэрацыі і працоўных арцелях рэгулюецца асобным законам.

128. Кантроль і нагляд за правільнаю пастаноўкаю вучнёўства ўскладаецца на органы Народнага Камісарыяту Працы.

### XIII. Праца жанчын і непаўналетніх.

129. Забараняецца ўжываць працу жанчын і асоб да 18 гадоў у асабліва цяжкіх і шкодных для здароўя работах.

Пералік такіх работ і максымальныя нормы пераноскі цяжараў для жанчын і непаўналетніх устанаўляюцца Народным Камісарыятам Працы па згодзе з ЦСПС.

130. Жанчыны і асобы да 18 гадоў не дапушчаюцца на начныя работы, апроч пералічаных у пастанове Народнага Камісарыяту Працы.

131. Не дазваляецца начная і звышмерная работа жанчын, пачынаючы з 6 месяца цяжарнасьці, і жанчын, якія кормяць грудзьмі на працягу першых 6 месяцаў кармленьня.

132. Вызваляюцца ад работы жанчыны, занятыя фізычнаю працаю на працягу 8-мі тыдняў перад родамі і 8-мі тыдняў пасьля родаў, а занятыя канторскаю і разумоваю працай—на працягу 6-ці тыдняў перад родамі і 6-ці тыдняў пасьля родаў.

Сьпіс прафэсій канторскай і разумовай працы, дла якіх устанаўляецца восем тыдняў адпачынку перад родамі і восем тыдняў пасьля родаў, выдаецца Народным Камісарыятам Працы.

Час, на які вызваляецца ад работы жанчына пры дачасных родах, пачынаючы з пятага месяца цяжарнасьці, устанаўляецца Народнымі Камісарыятамі Працы і Аховы Здароўя па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў.

133. Жанчыны, пачынаючы з пятага месяца цяжарнасьці, ня могуць пасылацца ў камандыроўкі бяз іх згоды на гэта.

134. Для жанчын, якія кормяць грудзьмі сваіх дзяцей, павінны быць устаноўлены, апроч агульных перапынкаў (арт. 100), яшчэ дадатковыя для кармленьня дзіцяці.

Тэрміны перапынку ўстанаўляюцца правіламі ўнутранага парадку. Перапынкі на кармленьне ня могуць быць радзей, як праз 3 з паловаю гадзіны і менш за паўгадзіны кожны. Перапынкі залічваюцца ў рабочы час.

135. Забараняецца прымаць на работу асоб да 16 гадоў. У выключных выпадках інспэктары працы маюць права дазваляць прымаць на работу непаўналетніх ад 14 гадоў.

136. Для асоб да 16 гадоў устанаўляецца чатырохгадзінны рабочы дзень.

137. Найменшая норма непаўналетніх рабочых (бронь-падлеткаў) для паасобных галін працы ўстанаўляецца спэцыяльнымі пастановамі.

**XIV. Ахова працы.**

138. Ніякае прадпрыемства ня можа быць адчынена, пушчана ў ход альбо перавезена ў іншае памяшканьне без дазволу органаў працы.

139. Усе прадпрыемствы і ўстановы павінны ўжываць патрэбныя захады для недапушчэньня і зьнішчэньня шкодных умоў работы, для недапушчэньня няшчасных выпадкаў і для ўтрыманьня месца работы ў належным санітарна-гігіенічным становішчы паводле пастаноў Народнага Камісарыяту Працы.

140. Машыны і варштаты на час перапынку ў рабоце павінны спыняцца апроч выпадкаў, калі спыняць іх немагчыма па тэхнічных умовах, альбо калі яны служаць для праветрываньня, адліву вады, асьвятленьня і інш.

141. На ўсіх асабліва шкодных работах і работах у ненармальнай тэмпэратуры, у вільгаці і на работах, што забрудняюць цела і да т. п. рабочым і служачым выдаюцца за кошт прадпрыемства спэцыяльная вопратка і перасьцярожныя прылады (акуляры, маскі, расьпіратары, мыла і г. д.) паводле сьпісу работ і норм, якія ўстанаўляюцца Народным Камісарыятам Працы.

142. Для перасьцярогі ад прафэсійнага атручваньня на адпаведных работах рабочым выдаюцца за кошт прадпрыемства супроцьатрутныя сродкі, тлушчы альбо нэйтралізуючыя матэры паводле сьпісу і ў разьмеры, устаноўленым Народным Камісарыятам Працы.

Калі ва ўстаноўлены тэрмін ня выданы спэцыяльная вопратка, перасьцярожныя прылады альбо супроцьатрутныя сродкі (арт. 141) і ячы набыты самімі рабочымі, альбо служачымі, то кошт іх аплачваецца прадпрыемствам альбо ўстановай рабочаму альбо служачаму па фактычнай іх цане.

143. Народны Камісарыят Працы і яго мясцовыя органы маюць права ўстанаўляць у асабліва шкодных работах абавязковы папярэдні абгляд усіх альбо паасобных груп рабочых (жанчын, непаўналетніх), што паступаюць на работу, а таксама і пэрыадычны перагляд іх.

144. Народны Камісарыят Працы па згодзе з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў мае права забараніць начныя работы ў тых прадпрыемствах, дзе яны не выклікаюцца пільнаю патрэбаю і асабліва шкодна адбіваюцца на здароўі рабочых.

145. Прадпрыемствы, установы і гаспадаркі павінны вывешваць на відным месцы Кодэкс аб Працы, усе пастановы і правілы аб ахове працы рабочых і служачых і весьці кнігі, прадугледжаныя пастановамі Народнага Камісарыяту Працы.

146. Нагляд за выкананьнем усімі ўстановамі, прадпрыемствамі, гаспадаркамі і асобамі гэтага Кодэксу, пастаноў і інструкцый аб працы і калектыўных дагавораў ускладаецца на інспэкцыю працы, тэхнічную інспэкцыю і санітарную інспэкцыю Народнага Камісарыяту Працы.

147. Інспэктары працы выбіраюцца на вызначаны тэрмін саветамі прафэсійных саюзаў і зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Працы.

148. Для ажыцьцяўленьня паказаных у арт. 146 мэт органы інспэкцыі працы:

а) маюць права наведваць ва ўсякі час дня і ночы ўсе прадпрыемствы, установы і гаспадаркі свайго раёну і ўсе месцы работы, а таксама ўсе існуючыя пры іх для рабочых кватэры, ясьлі і інш.;

б) маюць права патрабаваць ад уласьнікаў і загадчыкаў прадпрыемстваў, устаноў і гаспадарак патрэбныя весткі, кнігі і дакумэнты;

в) даюць заключэньні аб адчыненьні прадпрыемстваў і іх частак;

г) робяць загады, абавязковыя для дзяржаўных, грамадзкіх і прыватных устаноў, прадпрыемстваў, гаспадарак і асоб аб зьнішчэньні парушэньняў і іншых недахопаў у галіне аховы працы;

д) прыцягваюць да адказнасьці ў адміністрацыйным і судовым парадку за невыкананьне гэтага Кодэксу і іншых законаў і пастаноў аб працы.

149. Органы інспэкцыі працы маюць права ўжываць патрэбныя захады для зьнішчэньня ўмоў, якія беспасрэдна пагражаюць жыцьцю і здароўю рабочых, хаця-б такія захады і ня былі прадугледжаны законамі і пастановамі Народнага Камісарыяту Працы і яго мясцовых органаў.

150. Нагляд за выкананьнем загадаў, правіл і пастаноў аб прафэсійнай гігіене, фабрычнай санітарыі і тэхніцы бясьпекі ўскладаецца на санітарных і тэхнічных інспэктароў Народнага Камісарыяту Працы.

### XV. Прафэсійныя (вытворчыя) саюзы рабочых і служачых і іх органы ў прадпрыемствах, установах і гаспадарках.

151. Прафэсійныя (вытворчыя) саюзы, што яднаюць грамадзян, якія працуюць у наймах у дзяржаўных, каперацыйных, грамадзкіх і прыватных прадпрыемствах, установах і гаспадарках маюць права высту-

пацъ перад рознымі органамі ад імя рабочых і служачых, рабіць калектыўныя дагаворы, а таксама быць прадстаўнікамі ад іх імя па ўсіх пытаньнях працы і быту.

152. Прафэсійныя саюзы, што арганізуюцца на асновах, устаноўленых адпаведнымі зьездамі гэтых арганізацый, рэгіструюцца толькі ў іх міжсаюзных арганізацыях у парадку, устаноўленым Усесаюзным Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў.

153. Усякія іншыя аб'яднаньні, не зарэгістраваныя паводле арт. 152 у міжсаюзных органах, ня могуць называцца прафэсійнымі саюзамі і ня маюць іх праў.

154. Прафэсійныя саюзы маюць права: а) набываюць маемасьць і ўладаць ёю; б) заключаць дагаворы, згоды і інш.

Усе правы, якія даюцца прафэсійным саюзам, пашыраюцца і на іх міжсаюзныя аб'яднаньні.

155. Арганізацыі прафэсійных саюзаў і іх міжсаюзныя аб'яднаньні з правамі юрыдычнае асобы нясуць на падставах, вызначаных у Грамадзянскім і Грамадзянска-Працэсуальным кодэксах маемасную адказнасьць за абавязнасьці, якія вынікаюць з іх гаспадарчай дзейнасьці.

Арганізацыі прафэсійных саюзаў адказваюць за абавязнасьці вышэйшых і ніжэйшых органаў толькі тады, калі яны ўзялі на сябе такую адказнасьць.

156. Усе дзяржаўныя органы павінны, паводле арт. 8 Канстытуцыі БССР, рабіць прафэсійным саюзам і іх аб'яднаньням усякую дапамогу даючы ім абсталяваныя памяшканьні для пабудаваньня палацаў працы, дамоў саюзаў, льготнае карыстаньне поштаю, тэлеграфам, тэлефонам, чыгункамі, воднымі шляхамі і г. д.

157. Пачатковымі органамі прафэсійнага саюзу ў прадпрыемстве, установе і гаспадарцы зьяўляюцца камітэты рабочых і служачых (фабрычна-заводзкі, мясцовы і інш.) альбо дэлегат—упаўнаважаны саюзу, што замяняе камітэт.

Парадак выбараў і зацьверджаньня камітэту рабочых і служачых данага прадпрыемства, установы альбо гаспадаркі ўстанаўляецца адпаведным прафэсійным саюзам.

Ва ўстановах і прадпрыемствах Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў камітэты рабочых і служачых арганізуюцца і дзейнічаюць паводле спэцыяльнай пастановы.

158. Ніякі іншы камітэт у прадпрыемстве, установе і гаспадарцы, апроч паказанага ў арт. 157 гэтага Кодэксу, ня мае праў, якія даюцца арт. арт. 159—161.

159. Да кампэтэнцыі камітэту (арт. 157) належыць: а) прадстаўніцтва і абарона інтарэсаў рабочых і служачых перад адміністрацыяю прадпрыемства, установы альбо гаспадаркі па пытаньнях умоў працы і быту рабочых і служачых; б) прадстаўніцтва перад ураДавымі і грамадзкімі арганізацыямі; в) нагляд за выкананьнем адміністрацыяю прадпрыёмства, установы, альбо гаспадаркі ўстаноўленых законам норм для аховы працы, сацыяльнага страхаваньня, выплаты заработнае платы, правіл санітарыі і тэхнікі бясьпекі і інш., а таксама дапамога дзяржаўным органам аховы працы; г) мерапрыемствы для палепшаньня культурнага і матарыяльнага быту рабочых і служачых; д) дапамога нармальнай рабоце ў дзяржаўных прадпрыемствах і ўдзел праз адпаведныя прафэсійныя саюзы ў рэгуляваньні і арганізацыі народнае гаспадаркі.

160. Аб выбарах і пачатку дзейнасьці камітэту паведамляецца адміністрацыя. Колькасьць членаў камітэту рабочых і служачых, якія павінны звальняцца ад свае сталае работы для работы ў камітэце,

устанаўляецца ў наступнай норме: пры агульнай колькасьці рабочых і служачых прадпрыемства альбо гаспадаркі да 300 чал. ня больш 1 чалавека на ўвесь рабочы час, ад 300 да 1000—ня больш 2, ад 1000 да 5000—ня больш 3, звыш 5000—ня больш 5.

Члены камітэту звальняюцца ад работы ў прадпрыемстве альбо ўстанове адміністрацыяю на падставе пастановы камітэту.

161. За членамі камітэтаў (арт. 160) захоўваецца заработак іх кваліфікацыі, але ня менш адпаведнай тарыфнай стаўкі. Ім гарантуецца пасьля сканчэньня іх поўнамоцтваў работа ў даным прадпрыемстве, установе альбо гаспадарцы на падставе існаваўшага да выбараў дагавору найманьня з усімі зьменамі. Члены камітэту, кандыдаты ў члены камітэту, а таксама члены рабочае часткі расцэначна-канфліктных камісій могуць звальняцца з пасады з захаваньнем агульных правіл аб спыненьні і скасаваньні працоўнага дагавору (арт. арт. 44 і 47) толькі з папярэдняе згоды адпаведнага прафэсыйнага саюзу, без якое пытаньні аб звальненьні ня могуць вырашацца ў канфліктных органах.

162. Адміністрацыя ўстановы, прадпрыемства і гаспадаркі ня можа рабіць ніякіх перашкод дзейнасьці камітэту і агульных і дэлегацкіх сходаў, якія выбіраюць іх. Агульныя і дэлегацкія сходы павінны рабіцца ў нерабочы час. Калі-ж сход выконвае дзяржаўныя функцыі (выбары ў саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў, ва ўстановы сацыяльнага страхаваньня) альбо выбірае на зьезды прафэсійных саюзаў, то яны могуць адбывацца і ў рабочы час; у іншых выпадках гэта дазваляецца толькі па згодзе з адміністрацыяю. Такі парадак ужываецца і пры сходах у цэхах. Пасяджэньні камітэту адбываюцца таксама ў нерабочы час і толькі ў выключных выпадках, па згодзе з адміністрацыяй, усе члены камітэту могуць звальняцца ад работы для пасяджэньня ў рабочы час.

163. Адміністрацыя павінна паведамляць камітэт аб найманьні і звальненьні рабочых і служачых у парадку, устаноўленым спэцыяльным законам.

164. Сродкі на ўтрыманьне камітэту рабочых і служачых даюцца адміністрацыяй прадпрыемства, установы альбо гаспадаркі па каштарысу, зацьверджанаму адпаведным прафэсійным саюзам, у разьмеры ня больш 2 проц. усёй заработнай платы рабочых і служачых данае ўстановы, прадпрыемства альбо гаспадаркі.

Паказаныя ў гэтым артыкуле сумы выдаткоўваюцца камітэтам паводле правіл адпаведных прафэсійных саюзаў і ня могуць выдаткоўвацца ні на якія іншыя патрэбы.

165. Прафэсійныя саюзы маюць права патрабаваць ад адміністрацыі ўстановы, прадпрыемства альбо гаспадаркі, своечаснай выплаты сродкаў на ўтрыманьне камітэту, а таксама мець кантроль за іх паступленьнем і выдаткаваньнем.

166. Адміністрацыя ўстаноў, прадпрыемстваў і гаспадарак павінна даваць камітэту бясплатна патрэбнае памяшканьне з усім абсталяваньнем, апалам і асьвятленьнем для заняткаў камітэту і для агульных і дэлегацкіх сходаў рабочых і служачых. Уваход у гэтае памяшканьне па справах камітэту вольны.

167. Члены кіраўніцтва прафэсійных саюзаў, іх упаўнаважаныя паводле асобных мандатаў, а таксама і члены камітэту (арт. арт. 151 і 157) маюць права бесьперашкодна наведваць усе майстэрні, цэхі, аддзя-

леньні, ляборатoрыі і інш. у даным прадпрыемстве, установе альбо гаспадарцы.

168. Парушэньне правіл, паказаных у гэтым разьдзеле, выклікае адказнасьць паводле арт. 141 Крымінальнага Кодэксу БССР.

## XVI. Органы вырашэньня працоўных спрэчак і разгляду спраў па парушэньні пастаноў аб працы.

169. Органамі для разгляду спрэчак, якія ўзьнікаюць пры ўжываньні наймовае працы, зьяўляюцца: расцэначна-канфліктныя камісіі, міравыя камэры, пасрэдніцкія суды і працоўныя сэсіі народнага суда.

170. Справы аб парушэньні Кодэксу аб Працы і калякты̆ўных дагавароў, якія выклікаюць адказнасьць у крымінальным парадку, разглядаюцца ў працоўных сэсіях народнага суда.

171. Расцэначна-канфліктныя камісіі, міравыя камэры і пасрэдніцкія суды дзейнічаюць на падставе асобнага закону.

172. Працоўныя сэсіі народнага суда складаюцца: з старшыні—народнага судзьдзі і двух членаў—аднаго па выбары міжсаюзнага прафэсійнага аб'яднаньня, а другога—па выбары адпаведнага гарадзкога савету альбо раённага выканаўчага камітэту з ліку работнікаў гаспадарчых прадпрыемстваў і ўстаноў.

173. Парадак разгляду працоўнымі сэсіямі народнага суда працоўных спрэчак, а таксама спраў пра парушэньне заканадаўства аб працы і калякты̆ўных дагавораў, якія выклікаюць крымінальную адказнасьць, устанаўляецца інструкцыяй Народнага Камісарыяту Юстыцыі, узгодненай з НК Працы і з Цэнтральным Саветам Прафэсійных Саюзаў БССР.

## XVII. Сацыяльнае страхаваньне.

174. Сацыяльнае страхаваньне пашыраецца на ўсіх рабочых і служачых, занятых у дзяржаўных, каперацыйных, канцэсійных, арэндных, мяшаных альбо ў прыватных прадпрыемствах, установах ці гаспадарках альбо ў прыватных асоб і незалежна ад характару і даўжыні работы і спосабаў расплаты з імі.

175. Дапамога з сродкаў сацыяльнага страхаваньня выдаецца ў выпадках: а) часовай непрацаздольнасьці (хвароба, у паасобку прафэсійнае, працоўнае пакалечаньне, цяжарнасьць і роды, карантын, догляд за хворым членам сям'і); б) нараджэньня дзіцяці (на догляд і кармленьне); в) сьмерці, беспрацоўя; г) інваліднасьці і е) страты кармільца.

Органы сацыяльнага страхаваньня ўдзельнічаюць у арганізацыі мэдычнае дапамогі застрахаваным і ў скарыстаньні фонду мэдычнае дапамогі.

176. Для правядзеньня сацыяльнага страхаваньня ўстанаўляюцца страхавыя ўносы ў процантах ад заработнай платы. Разьмер страхавых уносаў у залежнасьці ад ступені шкоднасьці і бясьпекі прадпрыемстваў устанаўляецца спэцыяльнымі законамі.

Страхавыя фонды выдаткоўваюцца выключна на патрэбы забясьпечаньня рабочых і служачых.

177. Страхавыя ўносы плацяцца прадпрыемствам, установаю, гаспадаркаю альбо асобамі, што ўжываюць наймовую працу, бяз жаднага ўтрыманьня з заработнае платы застрахаваных. Нявыплачаныя ва ўстаноўленыя страхавымі органамі тэрміны страхавыя ўносы і пені па іх спаганяюцца, як падаткі. Пені зьнімаюцца толькі органамі сацыяльнага страхаваньня на падставе спэцыяльнага закону.

178. Дапамога пры часовай непрацаздольнасьці рабочым і служачым выдаецца ім у разьмеры іх поўнага заработку ад наймовае работы з выключэньнямі, устаноўленымі ў законах. Такая дапамога выдаецца ад дня спыненьня работы з прычыны страты працаздольнасьці да яе аднаўленьня, альбо ўстанаўленьня інваліднасьці.

179. Дапамога пры цяжарнасьці і родах выдаецца жанчынам, што працуюць у наймах, паводле артыкулу 132 гэтага Кодэксу.

180. Дапамога ў зьвязку з нараджэньнем дзіцяці выдаецца жанчынам, што працуюць у наймах, і жонкам рабочых і служачых, калі заработак кожнага з бацькоў ня больш за суму, пры перавышэньні якой паказаная дапамога паводле спэцыяльнага закону не выдаецца.

181. Дапамога на пахаваньне асобы, што працавала ў наймах, выдаецца тым асобам, якія трацяць грошы на пахаваньне, а дапамога на пахаваньне членаў сям'і асобы, што працуе ў наймах, калі яны былі на яе ўтрыманьні, выдаецца гэтай асобе.

182. Права на паказаную ў артыкулах 180 і 182 дапамогу маюць і беспрацоўныя, якія атрымліваюць дапамогу з прычыны беспрацоўя (арт. 183) і члены іх сем'яў, што страцілі кармільцаў, паводле палажэньня „Аб забясьпечаньні ў парадку сацыяльнага страхаваньня, у выпадку інваліднасьці і ў выпадку страты кармільца“ (З. З. СССР 1928 г. № 17, арт 146).

Асобы малодшага начальніцкага складу звыштэрміновай службы, сярэдняга, старэйшага і вышэйшага начальніцкага складу, якія знаходзяцца ў доўгатэрміновым водпуску, у запасе альбо зусім зволены ад службы, калі яны працуюць у наймах альбо атрымоўваюць ад органаў сацыяльнага страхаваньня дапамогу пры беспрацоўі апроч асоб, што атрымоўваюць пэнсію паводле „Палажэньня аб дзяржаўным забясьпечаньні кадравага начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі“ (З. З. СССР 1926 г. № 20, арт. 131) маюць права на прадугледжаную артыкуламі 180, 181 дапамогу незалежна ад стажу работы у наймах.

183. Дапамога па беспрацоўю выдаецца толькі тым беспрацоўным, якія раней працавалі ў наймах.

Асобы малодшага начальніцкага складу звыштэрміновай службы, сярэдняга, старэйшага і вышэйшага начальніцкага складу, якія знаходзяцца ў доўгатэрміновым водпуску, у запасе альбо зусім звольнены ад службы, апроч асоб, што атрымліваюць пэнсію ў парадку палажэньня аб дзяржаўным забясьпечаньні кадравага начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі (З. З. СССР 1926 г. № 20, арт. 131), маюць права на дапамогу з прычыны беспрацоўя незалежна ад таго, ці працавалі яны раней у наймах.

У дачыненьні да іншых асоб, звольненых у доўгатэрмінавы водпуск, у запас альбо зусім ад службы, мае сілу артыкул 87 Кодэксу законаў пра ільготы і перавагі для вайскоўцаў Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі і іх сем'яў.

Дапамога з прычыны беспрацоўя не выдаецца тым беспрацоўным, якім органамі Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі забаронена служба ў дзяржаўных, каперацыйных і іншых грамадзкіх установах, прадпрыемствах і арганізацыях.

184. Права на забясьпечаньне па інваліднасьці са сродкаў сацыяльнага страхаваньня маюць усе рабочыя і служачыя, што страцілі працаздольнасьць і члены іх сем'яў паводле палажэньня „Аб забясьпечаньні ў парадку сацыяльнага страхаваньня, у выпадку інваліднасьці і ў выпадку страты кармільца“ (З. З. СССР, 1928 г. № 17, арт. 146).

Права на забясьпечаньне з прычыны інваліднасьці са сродкаў сацыяльнага страхаваньня ня маюць асобы, якім органамі Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі забаронена служба ў дзяржаўных, каперцыйных і іншых грамадзкіх установах, прадпрыемствах і арганізацыях.

185. Рабочыя і служачыя маюць права на атрыманьне ўсіх дапамог, паказаных у артыкуле 175 гэтага Кодэксу, незалежна ад таго, ці ўплачаны прадпрыемствамі, установамі, гаспадаркамі і паасобнымі грамадзянамі страхавыя ўзносы за іх.

Вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР *А. Хацкевіч.*

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР *М. Карклін.*

За Сакратара ЦэнтральнагаВыканаўчага Камітэту БССР *У. Ігнатоўскі.*

27 ліпеня 1929 г.
г. Менск.